Ці ёсць у нашым жыцці магія і містыка?

СТАР 3

Куды ісці: да псіхолага ці да псіхатэрапеўта?

СТАР 3

Помнікі: хто іх гаспадар? Чаму мы забываем пра памяць?

СТАР 8

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

18 КАСТРЫЧНІКА 2013 г. ПЯТНІЦА № 197 (27562) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«ЦЯРПЛІВА БУДУЕМ СВОЙ ДОМ»

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка наведаў учора Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова. Як паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара, сустрэча са студэнтамі ВНУ праходзіла ў форме калоквіума, падчас якога Аляксандр Лукашэнка выступіў на тэму «Беларусь у кантэксце сучаснай цывілізацыі: мэты і перспектывы развіцця».

Фота БЕЛТА.

Кіраўнік дзяржавы таксама наведаў выставу, прысвечаную 100-годдзю ўніверсітэта. Аляксандр Лукашэнка ў 1975 годзе скончыў гістарычны факультэт гэтай ВНУ. У ліку вядомых выпускнікоў універсітэта — дзяржаўныя і грамадскія дзеячы, прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі, кіраўнікі ўстаноў адукацыі і культуры, чатыры Героі Савецкага Саюза і Сацыялістычнай Працы, лаўрэаты дзяржпрэмій СССР і БССР, чэмпіёны і прызёры Алімпійскіх гульняў, каля 400 заслужаных настаўнікаў і дзеячаў навукі.

«Свая незалежная дзяржава дае нам свабоду»

Выступаючы на сустрэчы са студэнтамі, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што трэба цярпліва выбудоўваць дзяржаву, каб жыццё беларусаў і іх дзяцей было добрым. Кіраўнік краіны адзначыў: «Жывём мы так, як жывём. Яшчэ не дасягнулі таго, што трэба». Гэтаму ёсць як аб'ектыўныя, так і суб'ектыўныя прычыны. У ліку аб'ектыўных — глыбокі крызіс, у якім цяпер знаходзіцца свет. Многія суб'ектыўныя прычыны тоящца непасрэдна ў нас саміх. «Трэба цярпліва ісці да будаўніцтва свайго дома, чаго б гэта ні каштавала, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Я да гэтага гатовы. Мне не лягчэй, чым вам. Ці гатовы вы? Падумайце кожны і зрабіце свой выбар, вызначцеся». «Я буду дбаць аб нашых беларусах і выбудоўваць іх жыццё, каб было добра ім і іх дзецям», — працягнуў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, нягледзячы на глабалізацыю, будучыня за суверэннымі дзяржавамі і асобнымі нацыямі. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што сёння чалавецтва перажывае глабальны цывілізацыйны зрух, калі нават законы грамадскіх адносін і маральныя нормы, якія здаваліся непарушнымі, паступова страчваюць сілу. «Інфармацыйная рэвалюцыя звяла на нішто ўсе прасторавыя і часавыя бар'еры. Эканамічныя працэсы ў свеце даўно выйшлі на наднацыянальны ўзровень. Чалавек навучыўся штучным шляхам атрымліваць найвялікшую з таямніц — зараджэнне жыцця, кланіраваць жывыя істоты», — сказаў Прэзідэнт.

Глабалізацыя вытворчасці і капіталу цягне за сабой вельмі сур'ёзныя трансфармацыі ў духоўнай сферы. «Мы бачым паступовае разбурэнне векавых маральных асноў, ператварэнне маральных анамалій у норму жыцця, сціранне нацыянальных, культурных адрозненняў паміж народамі, з'яўленне глабальнай англамоўнай неакультуры, заснаванай на амерыканскіх стандартах і ўзорах», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. «І сёння ўсё часцей узнікае пытанне: ці доўга праіснуюць у сучасным свеце суверэнныя дзяржавы, асобныя нацыі і народы, ці, можа, неўзабаве ўсе гэтыя паняцці будуць незваротна здадзены ў архіў гісторыі?» — задаў пытанне Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што беларусы доўга ішлі да атрымання дзяржаўнасці. «Свая незалежная дзяржава дае нам свабоду — тое, да чаго па прыродзе сваёй імкнецца кожны чалавек і кожная нацыя, свабоду жыць на сваёй, Богам дадзенай зямлі, свабоду самім выбіраць свой шлях, свабоду шанаваць свае традыцыі, сваё мінулае, распараджацца сваім сённяшнім днём, ладзіць сваю будучыню», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што «нават у так званай адзінай Еўропе не згасае імкненне народаў да самавызначэння». У якасці прыкладаў ён прывёў Шатландыю, Бельгію, іспанскую Каталонію. «І практычна няма ні адной еўрапейскай краіны, задаволенай вынікамі будаўніцтва агульнага еўрапейскага дома, які сёння, як ужо ўсім відавочна, трашчыць па ўсіх швах», — сказаў Прэзідэнт. «Таму з пункту гледжання будучыні асобных нацый і суверэнных дзяржаў, я, напэўна, сябе магу назваць гістарычным аптымістам, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Нягледзячы ні на якую глабалізацыю, паняцці Радзімы, Айчыны, незалежнасці сваёй зямлі яшчэ вельмі-вельмі рана спісваць у гістарычны архіў, з майго пункту гледжання».

«Стагоддзі існавання на скрыжаванні ўсходняй і заходняй традыцый дапамаглі Беларусі назапасіць унікальны духоўны вопыт. Наша нацыянальная ідэя — гэта мір , згода, узаемадапамога ў нашай вялікай агульнай сям'і, імя якой — беларускі народ. Гэта звычка жыць сваёй працай на сваёй зямлі. Гэта добрасардэчнасць да ўсіх, хто жыве побач з намі і хто прыходзіць да нас з мірам», — падкрэсліў Прэзідэнт. Так што, сказаў ён, калі ласка, прыязджайце, жывіце, купляйце кватэры, інвестуйце. «Але не замахвайцеся на наш кавалак зямлі, які нам падарыў Гасподзь. Гэта беларуская зямля, — сказаў Прэзідэнт. — Мы не збіраемся бегчы ў НАТА, нават у Еўрасаюз, але мы і нашай брацкай Расіі гаворым: так, вы нашы людзі, мы ўсе падобныя, вы нашы браты-расіяне, але гэтая зямля — беларуская», — падкрэсліў Прэзідэнт .

СТАР 2

ПЕРАДЗІМОВЫЯ КЛОПАТЫ МАЛАДОГА СТАРШЫНІ

Самаму маладому сярод старшынь сельсаветаў Браслаўскага раёна Паўлу АНТАНЁНКУ толькі 32 гады. Ён узначальвае выканкам Цяцеркаўскага сельскага Савета, абраны на гэтую пасаду роўна год таму. Дагэтуль быў настаўнікам сярэдняй школы ў роднай вёсцы Мількі.

— На тэрыторыі нашага сельсавета 49 населеных пунктаў — вялікіх вёсак і хутароў-аднахатак, — кажа Павел Вітольдавіч. — Хачу, каб да кожнага з іх была добрая дарога, каб жыхары, асабліва людзі старэйшага ўзросту, не адчувалі сябе забытымі, пакінутымі сам-насам са сваімі праблемамі.

Гэтымі днямі малады старшыня разам з іншымі работнікамі выканкама працуе на добраўпарадкаванні тэрыторыі, якая прылягае да будынка Цяцеркаўскага сельвыканкама (на фотаздымку).

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

■ Май на ўвазе

АД ІНТЭГРАВАНЫХ ТЭСТАЎ АДМОВІЛІСЯ. ЦІ КАНЧАТКОВА?

«У новай рэдакцыі правіл прыёму ў ВНУ і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, што знаходзіцца цяпер на разглядзе ў Савеце Міністраў і Адміністрацыі Прэзідэнта, змяненняў у структуры тэставых іспытаў на наступны год не прадугледжана, — запэўніла журналіста «Звязды» прэс-сакратар Міністэрства адукацыі Юлія ВАНІНА.

Упершыню ідэя ўвядзення інтэграваных тэстаў была агучана крыху больш як год таму. Яе аўтары прапаноўвалі аб'яднаць у адным тэсце рускую і беларускую мову, а ў другім — гісторыю Беларусі, сусветную гісторыю і грамадазнаўства. Логіка простая: чым шырэйшы набор экзаменацыйных дысцыплін у абітурыента на руках, тым большыя ў яго і магчымасці для выбару спецыяльнасці. І тым карацейшая экзаменацыйная кампанія.

Аднак у апанентаў гэтай ідэі адразу ўзнікла шмат пытанняў. Напрыклад, як за 90 хвілін можна праэкзаменаваць веды адразу па трох дысцыплінах? Тым больш што аб'яднанне некалькіх прадметаў ЦТ у адным тэсце не дазволіць дакладна высветліць за адведзены час узровень ведаў абітурыента ні па адным з прадметаў. А як можна ў адным тэсце аб'ядноўваць рускую і беларускую мову, калі моўная сітуацыя ў краіне такая, што нават у школах не рэкамендуецца ставіць у раскладзе побач урокі па рускай і беларускай мовах? Школьныя настаўнікі папярэджвалі, што, выконваючы заданні інтэграванага тэста, дзеці абавязкова сутыкнуцца з цяжкасцямі, звязанымі з пераходам ад адной да другой дзяржаўнай мовы.

Нагадаем, што ў апошнія гады цэнтралізаванае тэсціраванне праводзілася ў Беларусі па 14 дысцыплінах. Юлія Ваніна пацвердзіла той факт, што прагучала прапанова ўніфікаваць пры падачы дакументаў на роднасныя спецыяльнасці набор сертыфікатаў цэнтралізаванага тэсціравання. Таму сёння ў Міністэрстве адукацыі паралельна з падрыхтоўкай новых правіл прыёму ў ВНУ і ССНУ разглядаецца і пералік экзаменацыйных дысцыплін пры паступленні на роднасныя спецыяльнасці.

Надзея НІКАЛАЕВА

■ Надвор'е

ЗАВІТАЕ МОКРЫ СНЕГ

Няўстойлівае надвор'е чакаецца ў Беларусі ў бліжэйшыя выхадныя, паведаміла БЕЛТА галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Людміла Парашчук.

Як адзначыла галоўны сіноптык, сёння на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Месцамі, пераважна па паўднёвым усходзе краіны, згусцяцца туманы. Вецер будзе паўднёвы, умераны, днём па захадзе — парывісты. Днём паветра прагрэецца да 8-14 градусаў вышэй за нуль.

У суботу надвор'е ў Беларусі абумовіць халодны атмасферны фронт, які змяшчаецца з Балтыйскага мора. У сувязі з гэтым ноччу на большай частцы тэрыторыі, а днём у крайніх усходніх раёнах краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы, ноччу і раніцай месцамі — з мокрым снегам. У начныя гадзіны ў многіх раёнах, днём па ўсходзе чакаецца моцны парывісты вецер. Тэмпература паветра ў начныя гадзіны складзе плюс 1-6 градусаў, па паўночным захадзе магчымы замаразкі да мінус 3, днём будзе 4-9 градусаў са знакам плюс.

У нядзелю, 20 кастрычніка, днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, па паўночным усходзе — з мокрым снегам. Ноччу па паўднёвым усходзе сіноптыкі абяцаюць замаразкі да мінус 4. Тэмпература днём — плюс 3-10 градусаў, па Брэсцкай вобласці месцамі паветра прагрэецца да 12 градусаў.

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр МУХА, фінансавы аналітык даследчай групы BusinessForecast.by:

«Думаю, што прапанаваны ўрадам і Нацыянальным банкам сумесны план эканамічных рэформаў можа стаць пачаткам руху да рэалізацыі новай праграмы Міжнароднага валютнага фонду ў Беларусі, паколькі ў шэрагу выпадкаў мерапрыемствы плана наўпрост улічваюць рэкамендацыі міжнародных экспертаў, у тым ліку МВФ. Прадстаўнікі гэтай арганізацыі неаднаразова заяўлялі, што ўмовай для рэалізацыі новай праграмы ў Беларусі з'яўляецца наяўнасць сур'ёзнага плана эканамічных рэформаў. Тым больш што Беларусь з'яўляецца ўзорным пазычальнікам фонду: урад краіны абслугоўвае і пагашае свае абавязацельствы перад фондам своечасова і ў поўным аб'ёме. Больш за палову сумы бягучага крэдыту наш урад ужо выплаціў, і з эканамічнага пункту гледжання мэтазгодна разгледзець пытанне аб рэалізацыі новай праграмы МВФ у Беларусі».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.10.2013 г.

Долар ЗША	9160,00	▲
Еўра	12460,00	▲
Рас. руб.	285,50	▲
Укр. грыўня	1120,22	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 11°
Віцебск	+ 9°
Гомель	+ 11°
Гродна	+ 12°
Магілёў	+ 9°
Мінск	+ 8°

Новы садок у Іванаве

18 кастрычніка ў Іванаве ўрачыста адкрываюць новы дзіцячы садок. Для райцэнтра гэта значная падзея, бо дэфіцыт месцаў у дашкольныя ўстановы тут адчуваўся значны. На новы аб'ект з абласнога бюджэту было выдаткавана 42 мільярды рублёў. Да ўзвядзення садка спецыялісты ПМК-12 аб'яднання «Брэстаблсельбуд» прыступілі паўтара года таму і, паводле ацэнкі спецыялістаў, з задачай справіліся добра. Узведзены па арыгінальным праекце садок стаў сапраўдным упрыгажэннем жылога масіву, дзе кватэры набылі многія маладыя сем'і.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЗША ЗНОЎ УЗНЯЛІ МЯЖУ ДЗЯРЖДОЎГУ

Сенат і Палата прадстаўнікоў Кангрэса ЗША ўхвалілі праект аб павышэнні мяжы дзяржаўнага доўгу і аднаўленні фінансавання ўрада, паведамляюць інфармагенцтвы. Прынятае рашэнне дасць магчымасць пазбегнуць Злучаным Штатам Амерыкі дэфолту.

Дакумент прадугледжвае аднаўленне бюджэтных асігнаванняў на паўнавартасную працу федэральных міністэрстваў і ведамстваў да 15 студзеня. Павышэнне мяжы дзярждоўгу дазволіць ЗША працягнуць запазычанні да 7 лютага 2014 года. Мяркуецца, што да таго часу дэмакраты і рэспубліканцы ў Кангрэсе дамовяцца аб бюджэце на 2014 фінансавы год і аб сярэднетэрміновых захадах па скарачэнні дзяржвыдаткаў. Мяжа дзярждоўгу ЗША ў памеры $16,7 трлн, вызначаная законам, была дасягнута яшчэ ў маі. З таго часу міністэрства фінансаў выкарыстоўвае так званыя экстраардынарныя захады, каб пазбегнуць дэфолту па пазыковых абавязацельствах краіны.

У ЛАТВІІ ВЫРАСЛА КОЛЬКАСЦЬ ЗАГІНУЛЫХ АД НЕЛЕГАЛЬНАГА АЛКАГОЛЮ

Колькасць ахвяр атручання няякасным алкаголем у латвійскай Елгаве узрасла да васьмі чалавек. Пра гэта паведамляе TVNET са спасылкай на галоўнага ўрача Елгаўскай бальніцы Салвейгу Аболу. Напярэдадні паведамлялася пра шэсць загінулых. Усяго ў медыцынскую ўстанову з дыягназам «атручэнне» паступілі 11 чалавек. Паводле неафіцыйнай інфармацыі, яшчэ два жыхары Елгавы, якія ўжывалі «крутку» (так у Латвіі называюць нелегальнае спіртное), памерлі за межамі бальніцы. Сярод памерлых — жанчыны і мужчыны рознага ўзросту. Паліцыя ўжо ўстанавіла месца, дзе яны набылі нелегальны алкаголь. Па падазрэнні ў гандлі гэтай прадукцыяй затрымана пяць чалавек. У ходзе медыцынскай экспертызы высветлілася, што ўсе загінулыя атруціліся метылавым спіртам. Па звестках латвійскай асацыяцыі вытворцаў і распаўсюджвальнікаў алкаголю, доля нелегальнага спіртнога складае прыкладна трэць ад агульнага аб'ёму алкаголю, што спажываецца ў рэспубліцы. Папярэдні выпадак масавага атручання «круткай» адбыўся ў Латвіі ў 2006 годзе. Тады было шпіталізавана больш за 60 чалавек, двое памерлі.

УРАД РФ УХВАЛІЎ ТУРЭМНЫ ТЭРМІН ЗА КРАДЗЕЖ АЎТАМАБІЛЬНЫХ НУМАРОЎ

Расійскі кабінет міністраў падтрымаў законапраект, які прадугледжвае ўвядзенне крымінальнай адказнасці за крадзеж аўтамабільных нумароў — да чатырох гадоў пазбаўлення волі. Пра гэта паведамілі СМІ са спасылкай на аднаго з аўтараў ініцыятывы — першага намесніка старшыні Дзярждумы Вячаслава Лысакова.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ВАГА Ў ПАДЛЕТКАВЫМ УЗРОСЦЕ ЎПЛЫВАЕ НА РЫЗЫКУ АНКАЛАГІЧНЫХ ЗАХВОРВАННЯЎ

Падлеткі, якія маюць лішнюю вагу, у далейшым у два разы часцей сутыкаюцца з ракам страваводa, чым падлеткі з нармальнай вагой. Пра гэта сведчыць ізраільскае даследаванне, перадае Medical News Today. У працы прымаліся пад увагу медыцынскія даныя ізраільцян, чый узрост складаў прыкладна 17 гадоў. Гэта была інфармацыя аб індэксе масы цела мільёна падлеткаў, якую параўноўвалі з нацыянальнай статыстыкай па раку. Аказалася, акрамя высокай масы цела, рызыку рака павышаў нізкі сацыяльна-эканамічны статус і іміграцыя з краін, дзе ў прынцыпе павышана рызыка раку. Першы фактар павялічваў верагоднасць у 2,1 раза, а другі — у 2,2 раза. Калі падлетак меў 9 класаў адукацыі або менш, рызыка раку ўзрастала ў 1,9 раза. А імігранты з Азіі і СССР (сам пераезд адбываўся да 19 гадоў) мелі рызыку, павышаную ў 3 і 2,28 раза адпаведна. Верагодна, асноўная прычына — дыета і, у прыватнасці, узровень спажывання солі. Таксама важна курэнне і наяўнасць кіслотнага рэфлюксу. Усе гэтыя фактары звязаныя з небяспекай раку.

КАРОТКА

Расія зняла абмежаванні на пастаўкі свініны з шэрагу беларускіх прадпрыемстваў, паведамілі ў прэс-службе Федэральнай службы па ветэрынарным і фітасанітарным наглядзе РФ.

Аб'ём біржавых таргоў замежнымі валютамі на Беларускай валютна-фондавай біржы за трэці квартал 2013 года павялічыўся на 12 працэнтаў адносна другога квартала і склаў Br74,8 трлн. На таргах было прададзена 75,1 млрд расійскіх рублёў, $3,9 млрд, 1,6 млрд еўра, іншых валют — на суму Br440,4 млрд у эквіваленце.

Беларусы апошнія гады сталі ўжываць больш мяса і гародніны. У параўнанні з 2005 годам спажыванне за 2012 год агародніння-бахчавых культур на душу насельніцтва павялічылася на 17 кг і склала 145 кг, што адпавядае рацыянальным нормам спажывання гэтага віду прадукту (143,4 кг). За аналагічны перыяд узрасло спажыванне мяса і мясапрадуктаў (на 26 кг да 88 кг пры норме 70 кг), яек (на 51 штуку да 310 пры норме 257 штук).

ЯК ВЫ СТАВІЦЕСЯ ДА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫХ ШЛЮБАЎ?

Антон БЕЛЬСКІ, эканаміст:

— Нармальна. Бо, як той казаў, сэрцу не загадаеш. Іншая справа, калі інтэрнацыянальны шлюб ствараецца не на пачуццях, а дзеля нейкіх матэрыяльных выгод. Вось да такіх шлюбаў я стаўлюся адмоўна. Лічу, што ў Беларусі больш трывалы сямейны саюз магчымы паміж карэннымі жыхарамі краіны. Гэта звязана з тым, што ў ім будуць знаходзіцца людзі прыкладна аднолькавых культурных каштоўнасцяў і менталітэту. Муж і жонка ў такім выпадку будуць лепш разумець адно аднаго.

Марына ПЯТРОВА, кіраўнік літаратурна-драматычнай часткі НАДТ імя Якуба Коласа:

— На жаль, адназначнага меркавання не маю. Усё залежыць выключна ад канкрэтнага выпадку і канкрэтных людзей. Мне здаецца, што інтэрнацыянальны шлюб — гэта заўжды плюс яшчэ шмат праблем да класічнага «шлюбнага набору». Нехта бывае вымушаны змяніць месца жыхарства і апынуцца ў цалкам чужым свеце. Некаторыя такое лёгка пераносяць, іншыя — наўрад ці вытрымаюць і з-за гэтага сапсуюць адносіны. Чалавек павінен вельмі добра ведаць сябе. І калі ёсць адчуванне, што ён не зможа прыстасавацца да чужых умоў і быць шчаслівым, — не трэба «скакаць цераз галаву». Але ж усё залежыць ад выпадку. Калі ў двух людзей сапраўдныя пачуцці, яны паважаюць і насамрэч шкадуюць адно аднаго — нічога небяспечнага ў тым не бачу.

Вадзім КАЎТАНЮК, выкладчык БДУ:

— Да інтэрнацыянальных шлюбаў я стаўлюся вельмі негатыўна. Вядома, сэрцу не загадаеш, але мне здаецца, што два чалавекі рознай культуры не могуць жыць у згодзе доўгі час. Выхаванне адыгрывае значна большую ролю, чым нам падаецца на першы погляд. У тым ліку яно ўплывае і на будучыя шлюбныя адносіны. Чалавек бярэ за правіла тое, што ён назіраў падчас дзяцінства. Таму ўсе спробы дадаць крыху «экзотыкі» наўрад ці спрацуюць. Чалавек проста псуе сабе жыццё, шукаючы нешта неверагоднае замест таго, каб быць з чалавекам сваёй культуры.

Падрыхтавала Вікторыя ЧАПЛЕВА.

ISSN 1990 - 763X

«ЦЯРПЛІВА БУДУЕМ СВОЙ ДОМ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што пазіцыянаваць сябе ў свеце вельмі цяжка. «Але калі мы кажам, што павінны быць па-сапраўднаму суверэннымі і незалежнымі і заўтра, і паслязаўтра і пакінуць сваім дзецям нешта ў спадчыну, то павінны сціснуўшы зубы ісці сваім шляхам», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Калі Захад нас у чым-небудзь крытыкуе, значыць, мы робім правільна, калі пачынаюць хваліць — думай, дзе і што ты не так зрабіў», — дадаў ён.

Свабода — гэта не беззаконне

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што разумее свабоду як спакойнае жыццё і парадак у грамадстве, а не беззаконне. «Многія разумеюць свабоду так: выйшаў на вуліцу — што хачу, тое і раблю. Але твая свабода заканчваецца там, дзе пачынаюцца чужыя інтарэсы», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Не трэба разумець свабоду так, як нам часта яе падносяць і дыктуюць. Я гавару аб свабодзе ў больш шырокім сэнсе слова», — адзначыў Прэзідэнт. — Свабода — гэта не беззаконне, гэта спакойнае і ціхае жыццё і парадак у грамадстве. Я хацеў бы, каб на гэтым узроўні разглядалі свабоду, а не ў тым, што не дазваляюць штосьці сказаць. Ды гаварыце, што хочаце! Але навучыцеся слухаць іншых, засвойваць іх вопыт, асабліва старэйшага пакалення».

Прэзідэнт дадаў, што яму хацелася б, каб пакаленне моладзі не паўтарала памылкі бацькоў, а ўлічвала іх вопыт і ішло сваім шляхам, атрымліваючы максімум ад жыцця.

У будаўніцтва Палаца Незалежнасці не ўкладзена ні аднаго рубля бюджэтных сродкаў

Сёння, сказаў Прэзідэнт, ён часта чуе крытыку за Палац Незалежнасці. «Але паглядзіце на гэты цэнтр — Плошча сцяга, адноўлены «Белэкспа», дзе мы выстаўляем найлепшыя дасягненні нашага народа, і Палац Незалежнасці — яны нават не ведаюць, колькі гэта каштуе, за якія грошы пабудавана. Там няма ні аднаго бюджэтнага рубля. Дрэнна, што гэта пабудавана? Гэта — сімвал, і для краіны, як і для любога чалавека, гэта вельмі важна. Асабліва цяпер, калі мы хочам прэзентаваць сябе».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Палац Незалежнасці будзе адкрыты для людзей. «Гэта не рэзідэнцыя Прэзідэнта. Там, праўда, ёсць адзін рабочы кабінет для Прэзідэнта, больш там кабінетаў няма», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнт адзначыў, што ў палацы будуць выстаўляцца і падарункі Прэзідэнта, карціны, якія Аляксандр Лукашэнка прывёз з тых краін, якія ён наведваў. «Але гэтым цэнтрам мы падкрэслілі тое, што мы стварылі сваю дзяржаву», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што хацеў бы, каб у палацы праходзілі важныя і знакавыя для краіны мерапрыемствы: напрыклад, сустрэчы дэлегацый замежных дзяржаў, ушанаванне шматдзетных бацькоў, прыём у пі-янеры дзяцей з усёй рэспублікі.

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што ўсё ў Палацы Незалежнасці зроблена з айчынных матэрыялаў і самімі беларусамі. «Ён дэманструе, на што здольныя нашы людзі. Вось усе кажуць, што шмат хто з'язджае на заробкі. Але мы ж не закрыем іх тут, у нас не турма, а адкрытая краіна. Вось тыя, хто, так бы мовіць, застаўся, і зрабілі такую прыгажосць. І мы будзем гэта паказваць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Адраджэнню гісторыка-культурнай спадчыны — сур'ёзная ўвага

Студэнт пятага курса гістарычнага факультэта Яраслаў Хомчанка выказаў думку аб неабходнасці больш актыўных дзеянняў з боку дзяржавы па аднаўленні помнікаў гісторыі і архітэктуры, прыцягненні да гэтага працэсу бізнесу. Паводле слоў Прэзідэнта, дзяржава надае сёння даволі сур'ёзную ўвагу адраджэнню гісторыка-культурнай спадчыны. «Так, мы маглі б аднавіць усе замкі за адну пяцігодку, але, на мой погляд, і гэта можа не спадабацца гісторыкам, што тут сядзяць, на цяперашнім этапе важней для тысяч шматдзетных сем'яў пабудаваць кватэры, чым з руін і попелу аднаўляць замкі», — адзначыў ён.

Кіраўнік дзяржавы згадзіўся з думкай, што да адраджэння гісторыка-культурнай спадчыны трэба больш актыўна працягваць бізнес, ствараць для яго адпаведныя льготы. «Па шэрагу індывідуальных праектаў мы ідзём на гэта. Але паверце, што прыватнікі не кінуліся аднаўляць замкі. На жаль, многія бізнесмены бачаць у гэтым толькі камерцыйны інтарэс. Таму, прадастаўляючы льготы на аднаўленне таго ці іншага сацыяльнага аб'екта, мы павінны вельмі дакладна агаворваць умовы, каб у выніку, будзе гэта замак, установа аховы здароўя або спартыўны аб'ект, ён адпавядаў свайму прызначэнню», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён таксама паведаміў, што Беларусь працягвае весці перагаворы з Расіяй аб вяртанні ў краіну беларускіх культурна-гістарычных каштоўнасцяў. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што зусім нядаўна гаварыў з Прэзідэнтам Расіі аб вяртанні Слуцкіх паясоў. «Перагаворы ідуць цяжка. Думаю, пытанне мы вырашым, і будзе прыклад вяртання гэтых каштоўнасцяў», — сказаў ён. Аляксандр Лукашэнка таксама расказаў, што ў Беларусі завяршаецца стварэнне лініі па вытворчасці Слуцкіх паясоў. «Гэта будуць сапраўдныя Слуцкія паясы, зробленыя па тэхналогіі таго часу», — адзначыў Прэзідэнт.

«МЫ КОЖНЫ ГОД РЫХТУЕМСЯ ДА АНАМАЛЬНАЙ ЗІМЫ...»

Так адказаў на пытанне журналістаў пра тое, як ставяцца камунальнікі да інфармацыі, што гэтая зіма ў Беларусі, паводле прагнозаў заходніх сіноптыкаў, будзе надзвычай суровай, начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі Эдмунд ГРЫШКЕВІЧ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ён заявіў, што запуск сістэмы ацяплення ў краіне прайшоў у штатным рэжыме, нягледзячы на тое, што сёлета ацяпленне прыйшлося запускаць у першыя дні кастрычніка.

Начальнік аддзела энергетыкі і навукова-тэхнічнага развіцця Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Вячаслаў ШМІДТ адзначыў, што Мінжылкамгас сумесна з Мінгарвыканкамам і аблвыканкамамі рыхтаваўся да гэтага зімовага перыяду з улікам магчымых неспрыяльных умоў надвор'я, моцных снегападаў і нізкіх тэмператур. «Мы таксама зрабілі для сябе высновы ў ходзе ліквідацыі наступстваў цыклону «Хаўер» і ўлічылі іх», — сказаў Вячаслаў Шміт.

Арганізацыямі ЖКГ створаны рэзервовыя крыніцы цеплазабеспячэння, перасоўныя кацельні. Для ліквідацыі аварый на сістэмах цеплазабеспячэння створаны 972 аварыйна-выратавальныя брыгады колькасцю больш за 8,6 тыс. чалавек, падрыхтавана 14 перасоўных модульных кацельняў і 263 аўтаматычныя перасоўныя крыніцы электразабеспячэння, праведзена праверка гатоўнасці дыспетчарскіх службаў.

Аплата камунальных паслуг у ацяпляльны перыяд для стандартнай двухпакаёвай кватэры ў сярэднім складзе 306,5 тыс. рублёў.

У цэлым, па словах Эдмунда Грышкевіча, сёння па пытаннях ацяплення паступаюць толькі адзінкавыя скаргі, напрыклад, на разпаветрыванне батарэй. Па звестках рэспубліканскай дыспетчарскай службы масавых скаргаў, што дзесьці нешта не ўключана або хтосьці адчувае дыскамфорт, не зарэгістравана.

Аплата камунальных паслуг у ацяпляльны перыяд для стандартнай двухпакаёвай кватэры ў сярэднім складзе 306,5 тыс. рублёў. Па словах спецыялістаў, жыхарамі пры гэтым будзе кампенсавацца толькі 11,3-12 % ад кошту ацяплення.

Святлана БУСЬКО.

■ Мытны саюз

НЕ ТАКІ СТРАШНЫ ТЭХНІЧНЫ РЭГЛАМЕНТ...

Рэспубліканскі інстытут мяса-малочнай прамысловасці арганізаваў міжнародны навукова-практычны семінар на тэму заканадаўства Мытнага саюза ў малочнай галіне, каб абмеркаваць са спецыялістамі галіны ўсе «надводныя і падводныя камяні» ад увядзення адзіных тэхнічных рэгламентаў, якія ёсць і могуць узнікнуць у выніку яшчэ больш шчыльнага ўзаемадзеяння вытворцаў малочнай прадукцыі Беларусі, Расіі і Казахстана.

Тэма актуальная нават з-за таго, што яшчэ свежыя ў памяці так званыя «малочныя войны» — гэта калі нібыта Беларусь нешта там малочнае прадавала ў Расію з парушэннямі некаторых нарматываў... Час паказаў, што ў нас, «парушальнікаў», якраз і варта вучыцца многаму. Таму вось і сабраліся на канферэнцыю прадстаўнікі амаль што ўсіх малочных заводаў краіны ды яшчэ навукоўцы, спецыялісты сельскагаспадарчага ведамства, былі госці з-за мяжы — у прыватнасці, прадстаўнікі бізнес-групы DSM — галандскай кампаніі, што займаецца вытворчасцю бактэрыяльных заквасак і канцэнтратаў для малочнай і ўвогуле для харчовай галіны і з'яўляецца прызнаным сусветным лідарам у гэтай справе.

Асаблівасцю семінара стала і тое, што вучыцца новым рэгламентам прыехалі з усёй краіны менавіта тыя, хто і адказвае за якасць і стандарты прадукцыі — тэхнолагі, кіраўнікі аддзелаў якасці і лабараторый, спецыялісты па якасці, мікрабіёлагі, хімікі, ветэрынары з усіх вядомых малочных і сыраробчых заводаў. Як на звычайнага чалавека, дык нават веданне таго, што на нашых малочных заводах ёсць такія спецыялісты, дае падставу піць нашы кефіры, ёгурты, есці нашы сыры без аніякіх сумневаў. Але калі настаў час Мытнага саюза — дык менавіта Беларусь і арганізуе такія практычныя семінары для вытворцаў. Яшчэ адзін камплімент у бок нашых вытворцаў — менавіта яны захавалі на практыцы дзяржаўныя стандарты вытворчасці.

І яшчэ адна падстава, каб парупіцца пра якасць нашай «малочкі» — не сёння-заўтра многія краіны Еўрасаюза атрымаюць выпакутаванае імі права зноў павялічыць вытворчасць малака, і наш еўраазіяцкі рынак стане шчыльнейшым. Таму, каб выглядаць на ім прыстойна і канкурэнтназдольна, наш Мытны саюз і мусіць уніфікавацца па ўсіх сусветных нарматывах і ў межах нашых трох краін. Справа, зразумела, не ідзе пра тое, каб сыр, вяршкі, смятана ці тварог з Расіі, Беларусі ці Казахстана былі аднолькавымі на смак (пашы розныя, жывёла розных парод і г.д.). Галоўнае ў гэтых рэгламентах — выконваць агульныя нарматывы і дамоўленасці, не шкодзіць адзін аднаму на рынках, не перабіваць, як той казаў, пакупніка.

Другой нагодай семінара стала прэзентацыя новай харчовай лабараторыі, што рабілася па ініцыятыве інстытута з удзелам прадстаўнікоў галіны. Цяпер у ёй па ўсіх сучасных канонах будуць распрацоўваць рэцэпты і тэхналогіі на розныя малочныя прадукты, вучыць спецыялістаў і абменьвацца вопытам, весці навуковую работу. Так што тэхнічныя рэгламенты нашых інтэграцыйных утварэнняў — нам на карысць.

Пятро РАМАНЧУК

■

ЗАМЕЖНЫМ ЖУРНАЛІСТАМ АКРЭДЫТАЦЫЯ МЗС НЕ СПАТРЭБІЦЦА

Замежным журналістам не патрэбна будзе акрэдытацыя МЗС Беларусі для асвятлення чэмпіянату свету па хакеі 2014 года, які пройдзе ў Мінску. Адпаведны ўказ № 477 «Аб некаторых пытаннях асвятлення мерапрыемстваў чэмпіянату свету па хакеі 2014 года» падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Дакументам прадугледжваецца, што акрэдытацыя прадстаўнікоў замежных СМІ ажыццяўляецца Міжнароднай федэрацыяй хакея (IIХФ) і ў мэтах аптымізацыі працэдуры асвятлення мерапрыемстваў чэмпіянату свету па хакеі 2014 года атрыманне акрэдытацыі Міністэрства замежных спраў Беларусі не патрэбна.

«Такі парадак акажа істотную дапамогу ў забеспячэнні бязвізавага рэжыму знаходжання прадстаўнікоў замежных СМІ ў Беларусі і іх плённай рабоце па асвятленні мерапрыемстваў чэмпіянату свету па хакеі 2014 года. Акрамя таго, выкананне гэтай працэдуры пацвердзіць адкрытасць беларускай дзяржавы, прыхільнасць да нормаў і прынцыпаў міжнароднай практыкі пры правядзенні спартыўных мерапрыемстваў такога рангу», — адзначылі ў прэс-службе.

Разам з тым ва ўказе прадугледжваецца, што ў выпадку распаўсюджвання ў перыяд з 25 красавіка па 31 мая 2014 года замежнымі СМІ інфармацыйных паведамленняў і (або) матэрыялаў, не звязаных з асвятленнем мерапрыемстваў чэмпіянату свету па хакеі 2014 года, іх прадстаўнікам для ажыццяўлення на тэрыторыі Рэспублікі Беларусі прафесійнай дзейнасці патрабуецца атрыманне акрэдытацыі МЗС у адпаведнасці з заканадаўствам.

Указ уступае ў сілу з дня яго афіцыйнага апублікавання.

ДА ЧЭМПІЯНАТУ — ТУРЫСТЫЧНАЕ КОЛА

Для ўдзельнікаў і гасцей чэмпіянату свету па хакеі, які пройдзе ў наступным годзе, навукоўцы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі прапануюць распрацаваць маршрут «Турыстычнае кола горада Мінска». Улічваючы напружаны графік спаборніцтваў і тое, што чэмпіянат праводзіцца ў сталіцы, найбольш даступнымі будуць якраз аб'екты Мінска і яго наваколляў, прыводзяць яны слушны аргумент.

Як паведамілі ў прэс-службе НАН Беларусі, навуковай базай для такога праекта з'яўляюцца шматгадовыя даследаванні ў рамках падрыхтоўкі Зводу помнікаў гісторыі і культуры Беларусі, шматтомнага выдання «Гарады і вёскі Беларусі», а таксама інавацыйныя распрацоўкі па развіцці турызму лакальна-рэкрэацыйнага тыпу.

Аб'ектамі маршруту могуць стаць гарады, помнікі баявой славы, аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны — Заслаўе, гісторыка-культурны комплекс «Лінія Сталіна», гарадзішча на рацэ Менцы, Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і быту, сядзіба Чапскіх у вёсцы Прылукі, музейны комплекс «Дудуткі», мемарыялы «Трасцянец» і ў вёсцы Студзёнка, купалаўскія мясціны («Акопы», «Вязынка»), гарналыжныя комплексы «Сілічы», «Лагойск» і іншыя аб'екты.

Па меркаванні навукоўцаў, стварэнне такога маршруту не толькі дазволіць пазіцыянаваць славутасці наваколляў Мінска, але і стварыць новы прыцягальны турыстычны брэнд.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ А не шкодзь!

ЗА КАЗУЛЬ — У ТУРМУ

За дзвюх забітых казуль трое грамадзян заплацілі вельмі дарагую цану. Адзін ўспамінае пра тое паляванне ўжо за дротам. Дарэчы, спецыяльнае пасведчанне на паляванне і зарэгістраваную стрэльбу меў толькі адзін з іх, але ён мог здабываць у лясах выключна птушку.

— Жыхар Наваполацка прыехаў у госці да знаёмага ва Ушачы. Прыхапіў з сабой ружжо. У гаспадара таксама была стрэльба, праўда, незарэгістраваная (калісьці ён знайшоў яе ў лесе і пакінуў сабе). Мужчыны вырашылі папаляваць. Па дарозе заехалі да свайго знаёмага, які жыве ў адной з вёсак Ушацкага раёна, і той пагадзіўся скласці кампанію. У Мёрскім раёне паляўнічыя на полі забілі дзвюх казуль і пагрузілі тушы ў багажнік аўтамабіля. Але іх планы падзяліць здабычу парушылі супрацоўнік ДАІ і егер Дзісенскага лясгаса, — расказала **Святлана РАМАНОЎСКАЯ, намеснік пракурора Мёрскага раёна.**

За ўчыненае злачынства жыхар райцэнтра асуджаны на 1 год і 6 месяцаў пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах строгага рэжыму. Такое строгае пакаранне абумоўлена тым, што на рахунку грамадзяніна ўжо не адна судзімасць. А пакалькі яго таварышы па незаконным паляванні раней праблем з законам не мелі, ім прызначаны штраф: 250 базавых велічынь — жыхару Наваполацка і 200 — вяскоўцу.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■

■ Хакей

ЁСЦЬ 30-ТЫСЯЧНЫ!

Як паведаміла Дырэкцыя па правядзенні чэмпіянату свету па хакеі-2014, кампанія «Ticket Pro», афіцыйны білетны аператар хакейнага першынства, ужо прадаў на матчы 30 тысяч квіткоў.

Фота БЕЛТА.

Найбольшай папулярнасцю сярод балельшчыкаў карыстаюцца абанементы на гульні з удзелам беларускай каманды, аднак ёсць попыт і сярод балельшчыкаў з Канады, Расіі, Швецыі, Швейцарыі, Фінляндыі, Германіі, Нарвегіі, Эстоніі...

Продаж, як кажуць, расце як на дражджах. Калі напрыканцы мінулага тыдня прадалі толькі 909 абанементаў, то раніцай 17 кастрычніка іх колькасць дасягнула адзнакі ў 2363 абанементы!

Тарас ШЧЫРЫ

■

■ Сітуацыя

Запланавалі і... правалілі

Камітэт дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці правёў маніторынг ходу мадэрнізацыі на прадпрыемствах рэгіёна.

На роўным месцы

Толькі пасля ўмяшання старшыні Гродзенскага аблвыканкама Сямёна Шапіры ў сітуацыю з адкрытым акцыянерным таварыствам «Карэлічы-Лён» вырашылася праблема, якая, паводле ацэнкі Камітэта дзяржаўнага кантролю, была створана на роўным месцы.

Здавалася б, да мадэрнізацыі на прадпрыемстве як след падрыхтаваліся: усё пралічылі, атрымалі згоду на інвестыцыі — 99 мільярдаў рублёў крэдытных сродкаў. З гэтай сумы 49 млрд руб. летась асвоілі, а далей трэба было пабудаваць вытворчы будынак, завезці і змантаваць лінію і распачаць выпуск прадукцыі. Аднак... Да правядзення Камітэтам дзяржкантролю праверкі на прадпрыемстве не атрымалі дазвол на будаўніцтва, не прадаставілі ў банк належным чынам аформленыя дакументы для фінансавання. Хаця яшчэ ў маі, згодна з дагаворам, павінны былі завезці лінію. У выніку тэрміны ўводу аб'екта сарваныя (вытворчага будынка няма, лінія не завезена), а ўкладзеныя летась грошы аказаліся замарожанымі.

На што разлічвалі?

Асобныя прадпрыемствы да планаў мадэрнізацыі паставіліся фармальна, заяўленыя аб'ёмы інвестыцый не падмацаваны адпаведнымі разлікамі, сведчыць маніторынг Камітэта дзяржаўнага кантролю.

Напрыклад, Наваельнянскім камбінатам хлебапрадуктаў на сёлетні год заяўлены 183 мільярды рублёў інвестыцый на праект стварэння птушкакомплексу па вырошчванні і перапрацоўцы мяса індычкі. У сваю чаргу, асваенне сродкаў (адчуйце розніцу!) склала ўсяго... 15 мільёнаў рублёў — гэта кошт распрацоўкі бізнес-плана. Які ж сэнс быў у вышэйзгаданай заяўцы, калі адсутнічае архітэктурны праект, не праводзіліся маркетынгавыя даследаванні і ацэнка рынкаў збыту прадукцыі? Хаця выканаць гэта можна і трэба было раней, паколькі будаўніцтва комплексу прадугледжвалася праграмай развіцця птушкагадоўлі ў 2011-2015 гадах, зацверджанай пастановай урада. Чаго чакалі?

Падобная сітуацыя на Дзятлаўскім вінна-гарэлачным заводзе, дзе асвоена толькі 699 мільёнаў рублёў з заяўленага на сёлетні год аб'ёму інвестыцый 10,4 мільярда рублёў.

Канкурэнты не спяць

Цяпер у ААТ «Мастоўдрэў» рэалізуецца праект па арганізацыі вытворчасці драўнінавалакністых пліт. Прычым трэба мець на ўвазе магчымыя праблемы са збытам тавару ў сувязі са стварэннем у краіне аналагічных вытворчасцяў з агульным аб'ёмам прадукцыі, які ў 2,5 раза перавысіць патрэбнасць нашага ўнутранага рынку. А выхад на экспарт звязаны з высокай канкурэнцыяй з боку расійскіх, нямецкіх і іншых вытворцаў. Пры гэтым замежным прадпрыемствам «Кронаспан» у Смаргоні ўжо рэалізаваны інвестпраект па вытворчасці драўнінавалакністых пліт, а праект у Мастах у лепшым выпадку завершыцца ў канцы наступнага года.

Вядома, можна пажадаць мастаўчанам поспеху ва ўмовах узмацнення канкурэнцыі як на ўнутраным, так і на знешнім рынках. А таксама нагадаць, што мы ўжо маем перанасычэнне рынку вырабаў з ячэістага бетону, у выніку чаго сёння працуюць са стратамі Гродзенскі камбінат будаўнічых матэрыялаў і прадпрыемства «Смаргоньсілікатабетон». Хаця аб гэтым Камітэт дзяржаўнага кантролю папярэджваў Мінбудархітэктуры яшчэ ў 2009 годзе.

Барыс ПРАКОПЧЫК

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

У КРАІНЕ АМАЛЬ 7,5 ТЫСЯЧЫ РАМЕСНІКАЎ

Згодна з афіцыйнай інфармацыяй Міністэрства эканомікі, у нашай краіне на 1 кастрычніка ажыццяўляе сваю дзейнасць 7495 рамеснікаў. Адпаведны мінулагодні паказчык быў роўны 7175. За дзевяць месяцаў найбольшая колькасць фізічных асоб, якія выплацілі збор за ажыццяўленне рамеснай дзейнасці, зафіксавана ў Мінску (1612 чалавек) і Віцебскай вобласці (1248 чалавек). Менш за ўсё рамеснікаў у Магілёўскай вобласці (759 чалавек).

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

«МАБІЛЬНЫЯ» ТАРЫФЫ ПАДРАСТУЦЬ

З 1 лістапада аператар сотавай сувязі Velcom павялічвае кошт паслуг на тарыфных планах лінейкі «Прывітанне». Новыя цэны будуць апублікаваны ў той жа дзень на сайце кампаніі.

Як тлумачыцца, змяненне кошту паслуг будзе адбывацца з улікам дасягнутага з пачатку года ўзроўню інфляцыі, будуць уніфікаваны існуючыя перыяды тарыфікацыі нацыянальных і міжнародных званкоў, а таксама ўведзена адзіная пахвілінная тарыфікацыя. З улікам запланаваных змяненняў павелічэнне сярэдняга рахунку складзе 8 працэнтаў.

З 1 лістапада ўсім карыстальнікам тарыфных планаў лінейкі «Прывітанне» і тарыфнага плана «Сувязь без абавязкаў» стане даступным прызначэнне двух «любімых нумароў», якія дазволяць істотна аптымізаваць выдаткі на паслугі сувязі.

РАБАЎНІКА ДАПАМАГЛА ЗАТРЫМАЦЬ... ШКОЛЬНІЦА

Дзве сяброўкі прагульваліся па вуліцы Ванеева ў сталіцы. Нечакана яны ўбачылі, як малады мужчына пачаў вырываць з рук нейкай жанчыны сумку. Тая ўпала на зямлю, аднак рабаўнік не адступаў: цягнуў ахвяру па асфальце, пакуль тая ўсё ж не выпусціла з рук сумачку...

14-гадовая дзяўчына кінулася за рабаўніком і, дагнаўшы, схапіла таго за руку, запатрабаваўшы вярнуць сумку. Мужчына гэтага не чакаў, аднак хутка пачаў сварыцца і пагражаць школьніцы. Тая адышла ўбок, зрабіўшы выгляд, што спужалася.

— Злачынца кінуўся ў бліжэйшы двор. Дзяўчына ж, імкнучыся быць незаўважанай, пайшла за ім. Праз некалькі дваroў яна ўбачыла, як рабаўнік увайшоў у адзін з пад'ездаў. Пасля гэтага школьніца патэлефанавала па нумары «102», — паведаміла прэс-афіцэр Партызанскага РУУС г. Мінска Ганна Чыж-Літаш. — Калі на месца прыбылі міліцыянеры, школьніца паказала ім той самы пад'езд і апісала злачынцу. Адзін з супрацоўнікаў выказаў меркаванне, што, згодна з партрэтам, гэта мог быць паднаглядны, які якраз пражывае ў гэтым доме... 32-гадовы раней судзімы непрацуючы амаль адразу ва ўсім прызнаўся. А школьніцы за яе мужны ўчынак у прысутнасці настаўнікаў і аднакласнікаў уручылі ліст з падзякай, кветкі і грашовую прэмію.

Сяргей РАСОЛЬКА.

КАНФІСКАВАНА ЗОЛАТА

Дэкларацыю было што, але ж грамадзянка Рэспублікі Беларусь, якая ехала ў цягніку «Кіеў — Мінск», афіцыйна адмовілася ад прапановы мытнікаў у Рэспубліканскім пункце пропуску «Церахоўка».

У выніку пры правядзенні мытнага агляду яе багажу былі выяўлены залатыя зліткі: 5 штук вагой 50 грамаў і адзін 100-грамовы. Цяпер недэклараванне тавару разглядаецца як незаконнае перасоўванне праз мытную мяжу. Тавар, ацэнены на суму прыкладна Br175 млн, канфіскаваны. У прэс-групе Гомельскай мытні паведамілі, што па факце правапарушэння пачаты адміністрацыйны працэс.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ДВОЙЧЫ ЗА ДВА ДНІ

Пажары на зернесушылцы, якая належыць прыватнаму вытворчаму ўнітарнаму прадпрыемству і знаходзіцца за тры кіламетры ад Мазыра, выратавальнікам прыйшлося тушыць два разы за тыдзень.

Першы раз агнём было знішчана 10 тон насення сланечніку і пашкоджана 30. Праз два дні КЗС-40, пабудаваны два гады таму, зноў загарэўся знутры. На гэты раз страты крыху меншыя — адна тона насення. Прычыны пажару высвятляюцца, як і ў выпадку на полі ля вёскі Шырокае ў Буда-Кашалёўскім раёне. Там загарэўся камбайн, прызначаны для ўборкі кукурузы і выпушчаны тры гады таму. У прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях паведамілі, што да прыбыцця падраздзялення МНС кіроўца камбайна спрабаваў самастойнага тушыць сельскагаспадарчую машыну вогнетушыцелем, але ж не атрымалася. У выніку камбайн значна пашкоджаны.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

СЯМЕЙНУЮ СПРЭЧКУ «ВЫРАШЫЎ» НОЖ

У сталіцы ў гневе пенсіянерка схапілася за нож і ўдарыла ім сужэнца ў шыю.

Адбылося ўсё ў кватэры па завулку Каржанеўскага. Пасля сумеснага ўжывання алкаголю паміж 62-гадовай жанчынай і 64-гадовым мужчынам пачалася сямейная сварка. Гаспадыня не знайшла ў ёй лепшага аргумента, як схапіцца за нож... Як паведамілі ў Кастрычніцкім РУУС г. Мінска, сужэнцы пражылі разам доўгія гады, але апошнім часам шмат сварыліся. Прычынай трагедыі стала злоўжыванне спіртным галавы сям'і. Жанчына на гэты раз не змагла ўтаймаваць эмоцыі... У дачыненні да пенсіянеркі заведзена крымінальная справа. Мужчына знаходзіцца ў бальніцы.

ВАДАЛАЗ-ВЫРАТАВАЛЬНІК... БРАКАНЬЕР

На Асіповіцкім вадасховішчы за незаконную рыбалку быў затрыманы вадалаз-выратавальнік. Пры дапамозе стаўных сетак ён здабыў агулам 75 кілаграмаў ляшча і карася.

Як паведамілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, хаваючыся, ён пералез з уловам цераз двухметровую бетонную агароджу помпавай станцыі. Больш за тое, перад тым як загрузіць рыбу ў багажнік аўтамабіля, больш за паўгадзіны прыслухоўваўся і ўглядаўся ў цемру. Аднак інфармацыя пра проціпраўныя дзеянні браканьера паступала дзяржінспектарам ужо неаднойчы, таму на гэты раз на беразе парушальніка ўжо чакалі... Пазней работнікі інспекцыі знайшлі ў ціхім месцы і лодку з сеткамі.

Парушальніку цяпер трэба будзе пакрыць шкоду, нанесеную прыродзе, — 7,5 мільёна рублёў. А крымінальная справа, якая будзе заведзена ў яго дачыненні, прадугледжвае як штраф, так і пазбаўленне волі тэрмінам да трох гадоў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

АБСТАЛЯВАННЕ ЁСЦЬ — ПРАДУКЦЫІ НЯМА

Адкрытае акцыянернае таварыства «Рэчыцадрэў» яшчэ ў жніўні 2011 г. атрымала крэдыт на 114,5 тыс. еўра. На гэтыя грошы было закуплена тэхналагічнае абсталяванне па вытворчасці мэблі. Пры гэтым адсутнічала неабходная тэхналогія вытворчасці па абліцоўванні фасадаў мэблі і тэхналагічна звязанае абсталяванне, а таксама адпаведныя пастаўшчыкі сыравіны.

Дарэчы, купленае абсталяванне па тых жа прычынах не выкарыстоўваецца дагэтуль. У выніку вялікія сродкі скарыстаны прадпрыемствам неэфектыўна. Акрамя таго, кіраўніцтвам не прымаецца дзейсных захадаў па забеспячэнні загрузкі і ўцягванні ў гаспадарчы абарот іншага тэхналагічнага абсталявання, раней закупленага за кошт крэдытных рэсурсаў для рэалізацыі таго ж праекта. Камітэтам дзяржкантролю Гомельскай вобласці разглядаецца пытанне пра прыцягненне ААТ «Рэчыцадрэў» і яго службовых асоб да адміністрацыйнай адказнасці за дапушчаныя правапарушэнні.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Сяргей АСТРОЎСКІ:

«Я дакладна ведаю, што магія ў нашым жыцці ёсць!»

Ён малады, таленавіты і ўмее здзіўляць. І апошняе робіць прафесійна. Сустрэцца з ім вы можаце ў самым нечаканым месцы — у кавярні, гандлёвым цэнтры альбо проста на вуліцы. Не выключана, што нават атрымаеце прапанову патрапіць на блакітны экран. Таму што Сяргей Астроўскі з'яўляецца вядучым шоу «Містык» на тэлеканале АНТ. Зараз ідзе праца над новым праектам «Сяргей Астроўскі — неверагодная магія», дзе ілюзіяніст будзе дарыць цуд людзям... Беларускі маг можа чытаць думкі, падымаць прадметы ў паветра альбо змяняць іх форму ў вас на вачах, але ён не раскрые сваіх сакрэтаў. А вось падчас нашай сустрэчы Сяргей расказаў пра сваё закадравае жыццё, цяжкасці прафесіі і сюрпрызы для прыхільнікаў.

— У дзяцінстве вы сур'ёзна займаліся спортам. Што падштурхнула змяніць яго на сцэну?

— З сямі гадоў я пачаў займацца каратэ. Нават былі перыяды, калі я прапускаў заняткі. Потым, у старэйшых класах, пачаў сур'ёзна займацца спортам, паступіў у фізкультурны. Аднак на другім курсе мае інтарэсы змяніліся і я пачаў выступаць на сцэне.

Ёсць вядомы амерыканскі ілюзіяніст Дэвід Блэйн. Я глядзеў запісы яго выступленняў, і мне падабалася. А з часам прыйшло ўсведамленне таго, што спорт у любым выпадку застанецца ў маім жыцці. Але перспектыў у гэтай галіне я для сябе не бачыў. Зразумеў: не хачу займацца чымсьці, да чаго душа не ляжыць, бо гэта пустая трата часу.

— І як вы дзейнічалі, усведаміўшы, што душа ляжыць да сцэны?

— Спачатку хадзіў і здзіўляў сяброў. Нават не задумваўся, атрымаецца з гэтага нешта ці не. Потым з'явілася думка выступаць у клубах. Пачаў спрабаваць, знаёміцца з вядучымі. І паступова аказаўся там, дзе знаходжуся зараз, — на сцэне і на тэлебачанні.

— Спасцігаць майстэрства з чаго пачыналі?

— Шмат інфармацыі «па тэме» ёсць у інтэрнэце, але тое ў асноўным для дзяцей. Таму я спасцігаў майстэрства трукаў падчас прагляду розных тэлеперадач. Там, дзе прысутнічае спрытнасць рук, вучыўся сам. Але ж ёсць яшчэ і іншыя ўзроўні прафесійнага майстэрства, напрыклад, ментальная магія, чытанне думак. Сцэнічная магія, дзе можа спатрэбіцца і нейкі рэквізіт. І кожны від патрабуе нейкіх сваіх выдаткаў. Я пачынаў з карт — гэта класіка, можна сказаць. А зараз зрабіў так, каб і аўдыторыя магла прымаць удзел у маіх труках. І мне не патрэбна ніякіх прыстасаванняў — усё адкрыта.

— У якім кірунку вы зараз працуеце?

— Займаюся мікрамагіяй — гэта паказ трукаў з выкарыстаннем маленькіх прадметаў (карт, гадзінніка ці любога іншага невялікага прадмета, які можна ўзяць у рукі). У мяне ёсць і сцэнічныя нумары, але іх я вельмі рэдка паказваю. Хіба што на нейкіх тэлевізійных праектах. На сцэне я яшчэ працую ў рэчышчы ментальнай магіі, дзе чытаю думкі людзей, як калісьці рабіў Вольф Месінг. Ён быў першым у гэтым жанры.

— Раскажыце аб сваім супрацоўніцтве з тэлебачаннем...

— Пачыналі мы з маленькай рубрыкі «Містык», якая з'яўлялася ў эфіры канала АНТ кожную суботу. А зараз здымаем праект «Сяргей Астроўскі — неверагодная магія». Там ужо павялічыцца працягласць выпуску па часе і кожны раз будзе новае месца сустрэчы з героямі праграмы. Я раблю гэта ўсё з мэтай паказаць, што і ў нас ёсць людзі, якія валодаюць мастацтвам ілюзіі не горш чым недзе за акіянам. Мы ўсё здымаем, бо я рыхтую канцэртную праграму на паўтары гадзіны: у наступным годзе хочацца паездзіць з гастролямі.

— Якія сюрпрызы чакаюць у ёй гледачоў?

Я змяніў свае погляды на многія рэчы і сваё стаўленне да жыцця. Зразумеў, што можна зрабіць усё, калі ёсць жаданне.

— Пакуль не буду раскрываць усіх сакрэтаў. Скажу толькі, што праграма будзе змяшчаць невялікія трукі, якія я буду паказваць на сцэне. Палова сцэнарыя ў мяне ўжо гатова, засталося дапрацаваць другую. А там некалькі рэпетыцый — і можна будзе запускаць!

— Як публіка рэагуе на тое, што вы робіце?

— Рэагуюць па-рознаму. Калі браць людзей ва ўзросце ад 35 гадоў і больш, то яны здзіўляюцца таму, што я раблю і ім падабаецца ўбачанае. Але як толькі размова заходзіць пра ўдзел у здымках, то адразу ж пужаюцца. У моладзі таксама інтарэс мяжуе з нежаданнем быць пад прыцэлам тэлекамер. Але эмоцый заўсёды шмат.

— А здараюцца «збоі» падчас выступленняў?

— Не было ніколі. Бо, напрыклад, у той жа ментальнай магіі, дзе я чытаю думкі, не можа адбыцца ніякіх збояў. Тут, як пры яздзе на веласіпедзе, калі чалавек умее катацца на ім, то можа ўпасці хіба што з завязанымі вачамі. Таму пры адсутнасці нейкіх неспрыяльных фактараў усё заўсёды праходзіць добра. Калі я, бывае, прыходжу на месца будучага выступлення і разумею, што тут не вельмі зручна, тады спрабую нешта змяніць, каб было камфортна.

— З цяжкасцямі сутыкаецеся ў працы? Як аднаўляеце сілы?

